***Носік А.А.***

# АРГАНІЗАЦЫЯ ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ СА СТУДЭНТАМІ-МЕДЫКАМІ Ў ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт*
*Мінск, Беларусь*

**Анатацыя**: у артыкуле разглядаюцца асаблівасці правядзення выхаваўчай работы са студэнтамі медыцынскіх спецыяльнасцей і вызначаецца месца беларускай мовы ў прафесійнай дзейнасці ўрача Рэспублікі Беларусь.

*Ключавыя словы*: *выхаваўчая работа, беларуская мова, медыцына, урач Рэспублікі Беларусь.*

*Nosik A.A.*

# ORGANIZATION OF EDUCATIONAL WORK WITH MEDICAL STUDENTS IN THE PROCESS OF LEARNING THE BELARUSIAN LANGUAGE

*Belarusian State Medical University*
*Minsk, Belarus*

**Abstract.** The article discusses the features of educational work with students of medical specialties and determines the place of the Belarusian language in the professional activity of a doctor of the Republic of Belarus.

*Keywords*: *educational work, Belarusian language, medicine, doctor of the Republic of Belarus.*

Яшчэ І. Кант казаў, што самымі цяжкімі можна лічыць два вынаходніцтвы чалавека: майстэрства кіраваць і майстэрства выхоўваць. Выхаваўчая работа ў вышэйшай школе мае мэтанакіраваны характар і рэалізуецца ў адпаведнасці з дзяржаўнымі стандартамі. Асноўнымі накірункамі выхаваўчай работы ў вузе з'яўляюцца: грамадзянскае, патрыятычнае, духоўна-маральнае, фізічнае, выхаванне талерантнасць і інш. Ва ўніверсітэце на сённяшнім этапе створаны і працягваюць удасканальвацца ўсе ўмовы для развіцця талентаў студэнтаў і павышэння ўзроўню іх агульнай культуры.

Рэалізацыя выхаваўчых задач адбываецца праз удзел у музычных ансамблях, хорах, занятках танцамі, літаратурных гуртках і інш. Адным з накірункаў выхаваўчага працэсу з'яўляецца таксама выкарыстанне жыллёвага фонду і развіццё матэрыяльнай базы студэнцкіх інтэрнатаў, арганізацыя выхаваўчай работы і культурнага адпачынку ў інтэрнатах.

Сучасны ўзровень развіцця грамадства прадвызначае такую арганізацыю выхаваўчай работы, якая была б скіравана на фарміраванне гарманічна развітай асобы і зарыентавана на паспяховае ажыццяўленне прафесійнай дзейнасці ва ўмовах білінгвізму.

Выкладанне курса беларускай мовы для студэнтаў-медыкаў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Праграмай, якая прадугледжвае засваенне і прафесійнае выкарыстанне беларускай навуковай тэрміналогіі, выпрацоўку ў студэнтаў уменняў правільна ўспрымаць розную інфармацыю на беларускай

мове, а таксама дакладна і асэнсавана выказваць любую думку, спрыяць павышэнню грамадскага прэстыжу беларускай літаратурнай мовы як мовы тытульнай нацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Мэтай курса з’яўляецца выпрацоўка і замацаванне практычных уменняў і навыкаў дасканалага карыстання вуснай і пісьмовай мовай; развіццё моўна-эстэтычнага густу студэнтаў, звязанага з чысцінёй і правільнасцю мовы; пашырэнне і ўзбагачэнне прафесійнага лексічнага запасу будучых спецыялістаў, выпрацоўка ўменняў практычнага карыстання тэрміналогіяй і прафесійнай лексікай па абранай спецыяльнасці; фарміраванне ўстаноўкі на практычнае ўкараненне атрыманых студэнтамі ведаў у іх прафесійнай дзейнасці і іншых сферах сацыяльнай актыўнасці; выхаванне любові і павагі да мастацкага слова, духоўнай і інтэлектуальнай спадчыны беларускага народа, пачуцця нацыянальнай самапавагі і самаідэнтыфікацыі, імкнення да далейшага ўзбагачэння беларускай мовы. Зыходзячы з названых акалічнасцей, праца вядзецца на ажыццяўленне грамадска-патрыятычнага, духоўна-маральнага і эстэтычнага накірункаў выхаваўчага працэсу.

Напасрэдна выхаваўчая работа адбываецца ў адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай “Адукацыйная і моладзевая палітыка на 2016-2020 гады”, а таксама з Праграмай бесперапыннага выхавання дзяцей і навучэнцаў з ліку моладзі на 2016-2020 гады. Пералічаныя дакументы маюць на мэце арганізацыю выхавання ў адпаведнасці з патрабаваннямі сучаснага грамадства і будучым развіццём краіны.

З самага пачатку навучання беларускай мове (у нелінгвістычным вузе) першачарговай задачай з’яўляецца адказ на пытанні: хто вучыць? каго вучыць? як вучыць?

Далейшым этапам будзе фарміраванне станоўчага мікраклімату ў групе і матывацыя да вывучэння беларускай мовы ў сітуацыі нераўнапраўнага двухмоўя. На шляху да гэтага бачыцца неабходным выразна акрэсліць і дакладна давесці мэту і практычную значнасць авалодання беларускай медыцынскай прафесійнай лексікай (тэрміналогіяй).

Прафесія ўрача з’яўляецца адной з самых важных на зямлі. Фарміраванне будучага спецыяліста як высокамаральнай асобы – гэта складаны і шматгранны працэс, у арганізацыі якога задзейнічаны не толькі выхаваўчыя структуры УВА, але і кожны асобны выкладчык. Формы арганізацыі выхаваўчай работы адпавядаюць плану выхаваўчай работы кафедры, факультэта, вуза. Уся сістэма накіравана на фарміраванне кампетэнцый будучага спецыяліста і яго маральных якасцей. У выніку гэта дазваляе сфарміраваць асобу, здольную дапамагаць людзям у лячэнні фізічных і душэўных пакут.

Правядзенне літаратурных сустрэч з сучаснымі беларускімі пісьменнікамі і паэтамі, бардамі, рэдактарамі, тэле- і радыёвядучымі, спевакамі дэманструе ўзровень літаратурнай беларускай мовы і пацвярджае яе функцыянаванне ва ўсіх сферах жыцця сучаснага грамадства. Правядзенне творчых вечароў, на якіх студэнты ставяць беларускамоўныя інсцэніроўкі, чытаюць вершы (у тым ліку і свае), спяваюць песні пад акампанемент таксама з’яўляецца моцным сродкам яднання інтарэсаў і прывівання любові да ўсяго роднага.

Як паказвае практыка, вельмі запамінальным мерапрыемствам для студэнтаў з’яўляецца наведванне тэатра з праглядам беларускамоўных спектакляў. Яшчэ савецкія псіхолагі (Л. Выгоцкі, С. Рубінштэйн) пацвердзілі станоўчы ўплыў тэатра на развіццё разумовых, эстэтычных і маральных бакоў асобы. Уцягненне ў тое, што дзеецца на сцэне, актывізуе развіццё ўсяго творчага патэнцыялу чалавека і ўплывае на будову ўзаемаадносін з наваколлем. Таму сёння вельмі важна як мага часцей наведваць спектаклі на беларускай мове.

На сённяшні дзень для будучага ўрача Рэспублікі Беларусь надзвычай важна сфарміраваць правільнае разуменне сутнасці дзяржаўнага двухмоўя і выпрацаваць уменне жыць і працаваць у прававым полі, адным з важных аспектаў якога з’яўляецца прытрымліванне Закона Рэспублікі Беларусь “Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь” (Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 187-З ад 13 ліпеня 1998 г.). Сутнасць праблемы ў тым, што праз свае ўстановы дзяржава павінна забяспечыць кожнаму грамадзяніну права карыстацца той ці іншай мовай. Адсюль кожны супрацоўнік дзяржаўнай установы, з’яўляючыся прадстаўніком дзяржавы, павінен абавязкова валодаць дзвюма дзяржаўнымі мовамі [1]. Каб усвядоміць вышэйсказанае, павінна быць праведзена вялікая і правільна арганізаваная работа.

Такім чынам, з’яўляючыся прыкладам гуманізму, інтэлігентнасці, сумленнасці, прынцыповасці, бескарыслівасці, ветлівасці, павагі да навакольных самастойнасці, мэтанакіраванасці і многіх іншых станоўчых якасцей чалавека, адным з прыярытэтаў сваёй дзейнасці павінен мець паважлівае і адказнае стаўленне да беларускай мовы. Толькі ў такім выпадку Беларусь зможа захаваць сваю нацыянальную адметнасць і павагу з боку іншых дзяржаў свету.

Літаратура

1. Лукашанец, А. А. Беларуская мова ў XXI стагоддзі : развіццё сістэмы і праблемы функцыянавання / А. А. Лукашанец. – Мінск: Беларуская навука, 2014. – 396 с.

Репозиторий БГМУ